**"Радзіма мая Беларусь у асобах. Захавальнікі прыгожага»**

**21.12.2023**



Казачэнка Надзея Вітальеўна нарадзілася 15 марта 1968 года ў вёсцы Леніна. У 1985 годзе паступіла ў Гомельскі палітэхнічны тэхнікум. У 2013 годзе прайшла перападрыхтоўку ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтва. З 2010 года працуе ў Ленінскім сельскім клубе і з'яўляецца загадчыцай. Дзеці і дарослыя з задавальненнем наведваюць гурткі, якія працуюць у сельскім клубе. Асабліва цікава праходзяць народныя святы. З прыходам маладога спецыяліста акампаніятара Казлова Антона больш цікава праводзяцца канцэрты і розныя мерапрыемствы.



Асноўнымі напрамкамі дзейнасці клуба з'яўляюцца:

- арганізацыя культурнага вольнага часу розных катэгорый насельніцтва;
- грамадзянска-патрыятычнае выхаванне падрастаючага пакалення;
- праца па павышэнні духоўна-маральнага, інтэлектуальнага, творчага патэнцыялу маладога пакалення;
- прапаганда здаровага ладу жыцця і прафілактыка шкодных звычак.

Галоўная рыса Надзеі Вітальеўны – гэта гасціннасць. Яна з задавальненнем сустракае дзетак і гасцей. Надзея Вітальеўна любіць сваю



працу і ўсю душу ўкладае ў яе. Яна лічыць, што галоўнае – гэта знайсці сябе ў гэтым жыцці, прыносіць карысць людзям і ніколі не забываць тое месца, дзе ты нарадзіўся і вырас.